Часці і падраздзяленні 2-й ахоўнай («прыкрыцця») славацк
былі накіраваны ў пачатку 1942 г. славацкім урадам – саюзнікам гіт
Германіі – на тэрыторыю Палесся для абароны камунікацый і іншы
на чыгуначных лініях Жыткавічы–Калінкавічы, Сарны–Корасцен
Оўруч. Першыя дакументальныя звесткі аб прыбыцці славацкіх
Гомельшчыну адносяцца да канца сакавіка 1942 г., калі 102-гі слава
складзе нямецкай групіроўкі прымаў удзел у карнай аперацыі «
супраць партызан Акцябрскага і суседніх раёнаў [1, с. 57].

Пад уплывам актыўнай агітацыйнай і арганізатарскай работы
ных структур КП(б)Б і партызанскага камандавання ў славацк
і падраздзяленнях разгарнулася дзейнасць антыфашысцкага падпо
чаўся пераход воінаў-славакаў у атрады Палескай вобласці. Асабл
візаваўся выхад славакаў у лес зімой–вясной 1943 г.

У сувязі з разлажэннем асабовага складу дывізіі яе каманд
ўказанні з Берліну разгарнула рэпрэсіі і правяла рэарганізацыю
Быў выдадзены спецыяльны дакумент ад 27 мая 1943 г. з п

і загадамі аб арыштах славацкіх патрыётаў. Салдатам забаранялася выходзіць за межы гарнізона. Аднак такія захады камандавання дывізіі не спынілі пераходы славакаў у партызанскія атрады. Таму немцы вырашылі перакінуць славацкае злучэнне ў Мінскую вобласць. Яны перайменавалі яго ў 2-ю пяхотную дывізію і папоўнілі прызыўнікамі 1942 г.

Пасля передыслакацыі 2-й пяхотнай славацкай дывізіі летам 1943 г. на тэрыторыю Міншчыны ў ёй не спынілася антыфашысцкае супраціўленне. Адразу пасля атрымання разведвальнай інфармацыі аб перамяшчэнні славацкага злучэння падпольныя партыйныя структуры і камандаванне партызанскіх фарміраванняў, якія дыслацыраваліся на поўначы і паўночным усходзе Мінскай, усходзе Баранавіцкай, паўднёвым усходзе Вілейскай абласцей, атрымалі ўказанне ад падпольных абкамаў КП(б)Б аб неабходнасці разгортвання работы па разлажэнні славацкіх падраздзяленняў. У сваю чаргу, славакі-антыфашысты, атрымаўшы вопыт падпольнай барацьбы супраць гітлераўцаў на тэрыторыі Гомельшчыны, пачалі шукаць праз мясцовае насельніцтва кантакты з партызанамі.

Разнастайныя звесткі аб удзеле славакаў-антыфашыстаў у партызанскім руху на тэрыторыі Мінскай вобласці і іх ўзаемадзеянні з беларускімі партызанамі ўтрымліваюцца ў зборніку ўспамінаў «Огни партизанской дружбы» (1962 г.). Кніга падрыхтавана Інстытутам гісторыі АН БССР сумесна з выдавецтвам «Освета» (Брацілава). У кнізе змешчана 50 артыкулаў кіраўнікоў падпольных партыйных і камсамольскіх органаў, камандзіраў і палітработнікаў партызанскіх фарміраванняў Беларусі, славакаў-антыфашыстаў, якія займалі ў беларускіх партызанскіх атрадах пасады падрыўнікоў, разведчыкаў, камандзіраў груп, аддзяленняў і ўзводаў. 23 артыкулы прысвечаны асвятленню барацьбы славакаў-патрыётаў у складзе партызанскіх фарміраванняў Мінскай, Баранавіцкай і Вілейскай абласцей (цяпер тэрыторыя Міншчыны).

У Мінскай вобласці найбольшая колькасць славакаў ваявала ў брыгадзе «Дзядзькі Колі». У сваім артыкуле камандзір брыгады П. Р. Лапацін адзначыў, што камандаванне аператыўна ўстанавіла сувязь са славакамі аднаго з падраздзяленняў 102-га палка, які летам 1943 г. у сувязі з яго разлажэннем быў перадыслацыраваны з тэрыторыі Палескай вобласці. Падраздзяленне атрымала задачу ахоўваць участак дарогі Мінск–Масква. Праз разведчыкаў і сувязных удалося выявіць настроі сярод славацкіх салдат і афіцэраў, разгарнуць агітацыю па пераходзе іх на бок партызан. Аб важнасці гэтай работы сведчыць тое, што адразу пасля здабытай інфармацыі пра сітуацыю ў славацкім падраздзяленні па даручэнні камандзіра брыгады П. Р. Лапаціна намеснік начальніка аддзела штаба брыгады У. Рудак устанавіў сувязь з камандзірам самакатнага ўзвода сяржантам Войцехам Шатарам. 28 жніўня 1943 г. узвод перайшоў на бок партызан і захапіў з сабой 4 кулямёты, 100 гранат, вялікі запас патронаў. Акрамя ўзвода на бок партызан перайшла таксама група славакаў з вёскі Слабада. Камандзір брыгады правёў гутарку з кожным з воінаў-славакаў, якія перайшлі на бок партызан. У сваіх успамінах П. Г. Лапацін згадаў аб рашэнні камандавання ўключыць узвод В. Шата-

ра асобнай баявой адзінкай у склад партызанскага атрада «Камунар», а таксама паведаміў, у якіх аперацыях сумесна з беларускімі партызанамі ўдзельнічалі тры славацкія аддзяленні. Так, з 18 на 19 верасня 1943 г. славацкі ўзвод, як і беларускія партызаны, выйшаў на аперацыю па падрыве чыгуначных рэек на лініі Барысаў–Жодзіна. Важнае значэнне мела дзейнасць славакаў-партызан па разбурэнні тэлеграфна-тэлефоннай сувязі ад гітлераўскай стаўкі да фронту. Толькі за лістапад 1943 г. воіны-славакі пашкодзілі 3 400 метраў варожай надземнай сувязі і ў шмат якіх месцах быў перарэзаны падземны кабель. Ва ўспамінах П. Р. Лапаціна пералічаны прозвішчы славакаў, якія праявілі смеласць, мужнасць, адвагу і самаахвярнасць у барацьбе з акупантамі на тэрыторыі Барысаўскага і Смалявіцкага раёнаў [2, с. 190–197].

Славацкія падраздзяленні былі раскінуты практычна па ўсёй тэрыторыі Міншчыны, у тым ліку дыслацыраваліся і ў Мінску. У артыкуле С. А. Ваўпшасава паказана дзейнасць групы славакаў на чале з афіцэрам Рудольфам Зайцам у складзе спецатрада НКУС/НКДБ «Мясцовыя». Аўтар, камандзір спецатрада, адзначае, што пераход славакаў з зенітнага дывізіёна, які ахоўваў нямецкі аэрадром ў Мінску, старанна рыхтаваўся, каб пазбегнуць правакацый з боку гестапа. Пасля папярэдняй сустрэчы, 9 лістапада 1943 г. разам з разведчыкам К. Мурашкам, які па заданні камандавання займаўся пераходам славакаў, у спецатрад прыбылі 12 ваеннаслужачых дывізіёна. Аднак вывесці ўвесь асабовы склад артдывізіёна не ўдалося, бо ў падраздзяленні знайшоўся здраднік, які выдаў планы патрыётаў. Пасля пераходу групы астатнія славакі былі тэрмінова адпраўлены немцамі на фронт. Праз некаторы час Р. Заяц быў прызначаны камандзірам узвода ў спецатрадзе. У сваіх успамінах С. А. Ваўпшасаў указаў, что славакі не толькі хутка ўліліся ў партызанскі калектыў, але і адразу сталі ўдзельнічаць у баявых аперацых. Яны папоўнілі групы падрыўнікоў і разам з байцамі атрада правялі некалькі паспяховых аперацый на чыгуначных лініях Мінск–Асіповічы [2, с. 35–44].

У артыкуле В. А. Мілаванава змешчаны каштоўныя звесткі аб месцах дыслакацыі славацкіх падраздзяленняў на тэрыторыі Міншчыны. Сярод такіх названы Мінск, Чырвонае Урочышча, Уручча, Калодзішчы, Смалявічы. Аўтар адзначыў, што першыя славакі, якія перайшлі ў атрад імя С. Г. Лазо брыгады «За Савецкую Беларусь», прынялі ўдзел у падрыхтоўцы лістовак-зваротаў да славакаў, якія знаходзіліся ў гарнізонах. Агітацыйны матэрыял потым дастаўляўся да месца прызначэння партызанскімі сувязнымі і садзейнічаў масаваму выхаду славакаў у лес. Адзін з такіх пераходаў вялікай групы славакаў на чале са сваім камандзірам адбыўся 13 верасня 1943 г. з падраздзялення, якое абслугоўвала нямецкую радыёстанцыю ў Смалявічах. Група колькасцю 10 чалавек прынесла з сабой ў атрад «Пераможца» сакрэтныя дакументы, 22 пісталеты, 7 вінтовак, 2 аўтаматы, 25 гранат. У канцы восені 1943 г. славакі ваявалі ва ўсіх атрадах брыгады. Каб спыніць пераходы, нямецкае камандаванне пагражала, што сем'і славакаў-партызан на радзіме напаткае пераслед і канфіскацыя маёмасці. Па інфармацыі В. А. Мілаванава, славакі паказалі сябе стойкімі і храбрымі воінамі. Напрыклад, падчас бою

каля вёскі Старына Смалявічскага раёна 22 лістапада 1943 г. група славакаў разам з беларускімі партызанамі напала на вялікі атрад акупантаў, які рабаваў мясцовае насельніцтва. У гэтым баі інтэрнацыянальная група і падаспеўшая на падмогу рота партызан з населенага пункта Шэметава забілі 13 і паранілі 12 немцаў, прымусілі акупантаў пакінуць вёску Старына. Аўтар назваў славакаў, якія найбольш вызначаліся ў аперацыях супраць акупантаў, сярод якіх камандзіры аддзяленняў Мілаш Віленцень і Крышталіян Коцку. Першы ўдзельнічаў у падрыве сямі варожых эшалонаў, шасці аўтамашын, двух урадавых заданнях, пяці засадах, другі – у падрыве васьмі эшалонаў, шасці аўтамашын, трох засадах [2, с. 227–233].

Цікавая інфармацыя аб арганізацыі работы па забеспячэнні пераходу славакаў з гарнізона ў Ратамцы ўтрымліваецца ў артыкуле Ф. Ф. Хацкевіча, былога начальніка штаба імя А. В. Суворава 18-й брыгады імя М. Ф. Фрунзе. Да 1943 г. станцыя Ратамка ахоўвалася толькі немцамі. Аднак летам 1943 г. яе ахову часткова ўсклалі на славакаў, бо немцаў знялі з гэтага тылавога аб'екта і адправілі на ўсходні фронт. Улічваючы важнае значэнне станцыі Ратамка як аб'екта ў нямецкай камунікацыі, устанаўленне сувязі са славакамі было даручана сувязным, якія пражывалі ў гэтым населеным пункце. Падпольшчыкі спачатку вывучылі настроі славацкіх ваеннаслужачых шляхам правядзення з імі гутарак на адцягненыя тэмы. Аб разгортванні работы са славакамі сувязныя пастаянна інфармавалі камандаванне атрада імя А. В. Суворава і атрымлівалі ад яго неабходныя ўказанні і літаратуру. У выніку праведзенай агітацыйнай работы сувязныя ўстанавілі кантакты з камандзірам славацкай роты надпаручнікам Ладзілавам Сташко. Вакол яго пачалі гуртавацца салдаты, якія былі гатовы выйсці ў лес. Падчас першай сустрэчы Л. Сташко і трох яго падначаленых з камандаваннем атрада ў жніўні 1943 г. славакі перадалі звесткі аб руху цягнікоў на чыгуначнай лініі Мінск–Маладзечна, аб сістэме ўмацаванняў уздоўж дарогі, указалі найбольш зручныя месцы падыходу да чыгункі. На сустрэчы было дамоўлена, што славакі на пэўны час застаюцца ў гарнізоне для працягу работы па арганізацыі групы для пераходу. Дзякуючы атрыманай ад славакаў інфармацыі дыверсійная група атрада за кароткі час падарвала 5 варожых эшалонаў. Падчас наступных сустрэч славакі перадавалі не толькі неабходную інфармацыю, але і прыносілі патроны, гранаты, медыкаменты. Пераход групы славакаў на чале з Л. Сташко да партызан адбыўся 28 верасня 1943 г. Славакі прынеслі з сабой у атрад імя А. В. Суворава 10 ручных кулямётаў і аўтаматаў, 20 вінтовак, 10 пісталетаў і сотні гранат. Пасля прыбыцця славакаў рэйдам разам з партызанамі ў Налібоцкую пушчу, месца пастаяннай базы брыгады, Л. Сташко быў прызначаны намеснікам камандзіра атрада імя А. В. Суворава па разведцы, Стэфан Шарына – камандзірам узвода, некалькі славакаў па іх просьбе былі залічаны ў спецыяльную разведвальна-дыверсійную групу. Аўтар адзначыў, што славакі адразу ўключыліся ў баявую дзейнасць атрада і ў якасці прыкладу назваў некалькі аперацый, у якіх яны прынялі ўдзел. Славакі Ф. Ворчак, Т. Штыбла, Ш. Шарына былі сярод тых, хто вызначыўся

ў пачатку снежня 1943 г. падчас двухгадзіннага бою з акупантамі, што намерыліся рабаваць партызанскія вёскі Пціч, Паніжаны, Клюі. Славакі праявілі мужнасць і стойкасць пры пераходзе атрадаў брыгады раніцай 1 студзеня 1944 г. чыгункі ў раёне ўчастка Негарэлае–Коласава. Славацкія кулямётчыкі Ф. Ворчак, Ш. Шарына, М. Барло, Ф. Новак і інш. былі ў складзе групы, якая першая перайшла чыгунку, нанесла ўдар па агнявых кропках праціўніка, падавіла іх, што дазволіла брыгадзе хутка перайсці чыгунку і праз 7 сутак прыбыць да новага месца дыслакацыі ў Клецкім раёне. Ф. Ф. Хацкевіч паведаміў, што славакі сумесна з беларускім партызанамі ўдзельнічалі ў аперацыі «Баграціён» і назваў славацкіх байцоў, якія вызначыліся пры вызваленні Чырвонай Арміяй райцэнтра Клецк [2, с. 386–394].

Звесткі аб удзеле славакаў у баявых аперацыях атрада імя А. В. Суворава ўтрымліваюцца таксама ў артыкуле былога камандзіра дыверсійнай групы атрада імя А. В. Суворава 18-й брыгады імя М. В. Фрунзе В. П. Раманоўскага. У падраздзяленне, як і ў іншыя беларускія атрады, восенню 1943 г. пры дапамозе партызанскіх сувязных улілася вялікая група добра ўзброеных славацкіх салдат на чале з камандзірам роты Ладзіславам Сташко. Аўтар назваў прозвішчы славакаў і партызанскіх сувязных, якія адыгралі важную ролю ў паспяховым пераходзе. Ужо будучы ў атрадзе, Л. Сташко падтрымліваў сувязі са славацкімі патрыётамі з гарнізона ў Ратамцы і атрымліваў ад іх разведдадзеныя. Па ініцыятыве Л. Сташко была арганізавана засада ў раёне раз’езда Зялёнае супраць групы гітлераўскіх афіцэраў на чале з генералам. Немцы мелі задачу 12 кастрычніка 1943 г. праверыць абарончыя аб’екты, пабудаваныя ўздоўж чыгункі Мінск–Маладзечна. Дыверсійная група для правядзення аперацыі была ўзмоцнена 12 славакамі. У выніку аперацыі партызаны ліквідавалі 13 акупантаў, у тым ліку генерала. У артыкуле падрабязна апісана дыверсія на чыгуначнай лініі Маладзечна–Мінск у раёне станцыі Крыжоўка. У правядзенні дыверсіі на ўчастку дарогі, які моцна ахоўваўся немцамі, у складзе групы былі славакі-падрыўнікі. Партызаны не толькі скінулі пад адхон эшалон, але дзякуючы славаку Рудольфу Гасілю здолелі без страт вярнуцца ў атрад [2, с. 277–282].

Большасць артыкулаў аб сумеснай барацьбе супраць немецка-фашысцкіх акупантаў на тэрыторыі Міншчыны ў 1943–1944 гг. у зборніку – гэта ўспаміны былых партызан-славакаў. Ва ўспамінах Эміля Баліша змешчана інфармацыя пра славакаў у складзе атрада «Грозны» брыгады «Штурмавой», у якой разам з беларускімі партызанамі ваявалі дзясяткі славакаў. Адзначана, што ў ліпені 1943 г. 2-гі славацкі батальён 101-га палка быў размешчаны ў раёне пасёлка Краснае, дзе базіраваліся даволі значныя сілы партызан. Апісана, як у такой сітуацыі славакі-антыфашысты праз мясцовых жыхароў пачалі шукаць кантакты з партызанамі. Пасля ўстанаўлення сувязі ў верасні 1943 г. пры дапамозе партызан група славакаў-антыфашыстаў аператыўна выйшла ў лес, бо немцы рыхтавалі тэрміновую перадыслакацыю батальёна ў Італію. У атрадзе «Грозны» ужо было некалькі славакаў і чэхаў, якія перайшлі раней. Група славакаў адразу была ўключана ў правядзенне

баявых аперацый. Так, яны ўдзельнічалі ў падрыве маста на дарозе Маладзечна–Краснае, у выніку чаго былі ліквідаваны 18 акупантаў. Самай значнай аперацыяй, у якой прынялі ўдзел славакі, стала аперацыя па перахваце грузавой машыны з мінамётамі і мінамі, адпраўленай немцамі з Заслаўя ў Мінск. Суправаджаў машыну ўзвод славакаў, які дыслацыраваўся ў Заслаўі. Партызанам, у тым ліку і байцам-славакам, пасля зробленага завалу на мосце ўдалося спыніць машыну, а затым яны шляхам перагавораў параканалі ўзвод славакаў перайсці ў атрад і перадаць туды ваенны груз. Аўтар згадаў яшчэ аб некалькіх аперацыях на чыгунцы Мінск–Вільнюс і Маладзечна–Полацк [2, с. 24–28].

У артыкуле былога партызана атрада імя С. М. Будзённага Францішыка Зацько ўказана, што, нягледзячы на пастаянную перадыслакацыю славацкіх падраздзяленняў, антыфашысты шукалі магчымасць устанавіць сувязь з беларускімі партызанамі. Адным з такіх месцаў дыслакацыі для 7-га аўтабатальёна, які абслугоўваў 102-гі пяхотны полк, стаў Мінск. Пасля ўстанаўлення кантактаў з партызанамі славакі сталі перадаваць ім зброю і боепрыпасы. Напрыклад, паручніку Паўловічу ўдалося дастаць ў нямецкім штабе план абароны Мінска. У партызанскім атрадзе славакі былі прызначаны на розныя пасады, у тым ліку падрыўнікоў. Напрыклад, яны ўдзельнічалі 16 снежня 1943 г. у падрыве эшалона каля станцыі Ратамка, у выніку чаго ён быў скінуты пад адхон [2, с. 121–126].

У артыкуле былога камандзіра аддзялення, а затым памочніка камандзіра ўзвода атрада імя М. І. Кутузава брыгады «Смерць фашызму» В. Фібіха апісаны працэс пераходу славакаў у партызаны пасля іх перамяшчэння ў Мінскую вобласць. Згадана, што некаторыя славакі перайшлі да партызан адразу па прыбыцці ў Мінск. Пасля двух месяцаў муштры ў Мінску славакаў адправілі ў Жодзіна, дзе антыфашыстам удалося звязацца з разведкай партызанскага атрада. Славакі перадавалі партызанам патроны і гранаты, а пры дапамозе магнітных мін, дастаўленых разведчыкамі з атрадаў, падрывалі стрэлкі на чыгуначных станцыях і аўтамашыны. У сувязі з пагрозай накіравання славакаў-антыфашыстаў у іншае месца, яны ў ноч з 12 на 13 верасня 1943 г. тэрмінова пакінулі падраздзяленне і на машыне выехалі ў лес. У атрадзе імя М. І. Кутузава Мінскай вобласці яны адразу былі ўключаны ў баявую работу. У пачатку кастрычніка 1943 г. беларускія і славацкія партызаны сумесна наносілі ўдары па чыгунцы паміж Мінскам і Барысавам, пашкоджвалі тэлефонны кабель уздоўж шашы. Узгаданы і трагічны факт, калі падчас карнай аперацыі «Кармаран» некаторыя партызаны, у тым ліку і славакі, былі захоплены акупантамі і адпраўлены ў лагер для ваеннапалонных у Лукенвальд, дзе ўтрымліваліся дзясяткі тысяч чалавек розных нацыянальнасцей [2, с. 377–385].

Ва ўспамінах Фердынанда Хромека, былога камандзіра разведгрупы атрада «За Савецкую Беларусь» Мінскага злучэння, адзначана, што з прычыны частых пераходаў у партызаны падраздзяленне, у якім ён служыў у Оўручы, гітлераўскае камандаванне перакінула ў Мінск. На новым месцы

славакі-ваеннаслужачыя адразу праз мясцовых жыхароў сталі шукаць сувязь з партызанамі. Пасля ўстанаўлення кантактаў з партызанамі ў вёсцы Старына Мінскага раёна славакі пры дапамозе сувязных сталі перасылаць у атрад «За Савецкую Беларусь» медыкаменты, прадукты, цыгарэты. Пасля дыверсіі на хлебапякарні група славакаў 14 верасня 1943 г. перайшла да партызан, пры гэтым захапіла з сабой зброю, медыкаменты, правіянт. Аўтар даў апісанне дзвюх дыверсій на чыгуначных камунікацыях з удзелам славакаў-партызан, у адной з якіх ён, цяжка кантужаны, быў знойдзены партызанскай разведкай [2, с. 403–407].

Большасць славакаў, якія перайшлі на бок партызан на тэрыторыі Міншчыны, былі ўключаны ў склад груп падрыўнікоў. Пра ўдзел славакаў у аперацыях на немецкіх камунікацыях згадвае ў сваіх успамінах былы партызан атрада «За Савецкую Беларусь» брыгады імя М. В. Фрунзе Багуслаў Смешны. Адна з дыверсій з удзелам славакаў была праведзена на чыгунцы Вілейка–Маладзечна. Падчас гэтай аперацыі геройскі загінуў славак Барас Кахыр, які цаной свайго жыцця падарваў нямецкі воінскі эшалон з жывой сілай [2, с. 417–418]. Звесткі пра ўдзел славакаў у дыверсійнай дзейнасці на поўначы і паўночным захадзе ад Мінска ўтрымліваюцца ў артыкуле Францішка Ліптака, які ваяваў у брыгадах «Штурмавая» і «Народныя мсціўцы імя В. Т. Варанянскага». У выніку аперацыі на чыгуначнай лініі за 500 метраў ад станцыі Заслаўе партызаны спачатку падарвалі мост, чым адцягнулі ўвагу аховы, а затым скінулі пад адхон эшалон, які накіроўвася на фронт [2, с. 166–167]. У групу падрыўнікоў у атрадзе «Сцяг» брыгады «Разгром» разам яшчэ з трыма славакамі быў уключаны Ян Ломаў. Першы эшалон быў падарваны ў лістападзе 1943 г. на чыгуначнай лініі Смалявічы–Барысаў. Новае заданне на камунікацыях групе давялося выконваць у надзвычай цяжкіх умовах, бо немцы на кожным кіламетры чыгункі пачалі расстаўляць ахову, пабудавалі старажавыя вышкі, замініравалі падыходы да палатна, выстаўлялі патрулі з сабакамі. Нягледзячы на ўзмацненне аховы, партызанам групы пры дапамозе сувязных з месцовага насельніцтва ўдалося падарваць эшалон [2, с. 178–179].

На тэрыторыі Мінскай вобласці за жнівень–кастрычнік 1943 г. перайшлі больш за 150 славакаў-антыфашыстаў. Найвялікшая колькасць славакаў знаходзілася ў брыгадах Міншчыны: «Дзядзькі Колі» – 35, «Штурмавой» – 26, «За Савецкую Беларусь» – 22, у 18-й брыгадзе імя М. В. Фрунзе – 17. Пераходзілі славакі таксама ў брыгады «Разгром», «Народныя мсціўцы імя В. Т. Варанянскага», імя М. В. Фрунзе, «Смерць фашызму» і інш. Аўтарам падлічана, што славакі ваявалі ў складзе 23 брыгад і аднаго асобнага атрада Мінскай вобласці [3, л. 39–70].

У партызанскіх атрадах славакі адразу ўключаліся камандаваннем у баявую работу. Большасць славакаў, якія мелі пэўны ваенны досвед, уводзілася ў склад дыверсійных груп, прызначаных для нанясення ўдараў па камунікацыях, найперш чыгуначных. Баявымі групамі з удзелам славакаў на тэрыторыі Міншчыны былі падарваны дзясяткі эшалонаў.

Перадыслакацыя 2-й славацкай пяхотной дывізіі на тэрыторыю Міншчыны не спыніла разлажэнне яе падраздзяленняў, і таму гітлераўскае камандаванне было вымушана ў канцы 1943 г. перакінуць яе на італьянскі фронт.

ЛІТАРАТУРА

1. Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941–1945 : энцыклапедыя / Беларус. сав. энцыкл. ; рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд) [і інш.]. – Мінск, 1990. – 680 с.

2. Огни партизанской дружбы: сб. / Ин-т истории АН БССР; Изд-во «Освета» (Братислава). – Минск : Госиздат, 1962. – 419 с.

3. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 1450. Воп. 2. Спр. 1016.